ЗАЦВЕРДЖАНА
Дырэктар установы "Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры"
_______ С.І.Усік
"28" __11__ 2022

ЗАЦВЕРДЖАНА
Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта
_______ М.М.Башко
"28" __11__ 2022 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Старшыня Мінскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі"
_______ Л.М.Крыванос
"28" __11__ 2022 г.

# Палажэнне
## аб творчым конкурсе "Янка Маўр: вандраванне па зорках", прысвечаным 140-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Янкі Маўра

### 1. Агульныя палажэнні

1.1. Творчы конкурс "Янка Маўр: вандраванне па зорках", (далей – конкурс) прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Янкі Маўра, праводзіцца з мэтай фарміравання патрыятызму, прывіцця любові і павагі да роднага краю.

1.2. Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляюцца:

папулярызацыя і развіццё беларускай літаратуры;

развіццё пазнавальнай цікавасці да літаратурнай творчасці Янкі Маўра;

пашырэння кола чытачоў беларускамоўных выданняў;

удасканаленне сістэмы выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі Мінскай вобласці на падставе фарміравання каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, сацыяльнай адказнасці;

выяўленне і заахвочванне таленавітых навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, фарміраванне матывацыі да актыўнай творчай дзейнасці;

стварэнне аптымальных умоў для творчага развіцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі;

прыцягненне ўвагі грамадскасці да важнасці літаратурнай і мастацкай творчасці.

1.3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца ўстанова "Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры", галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, Мінскае абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі".

1.4. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Мінскай вобласці.

1.5. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

"Літаратурная творчасць";

"Выяўленчае мастацтва";

"Інсцэніроўка (мініяцюра)".

1.6. Конкурс праходзіць у наступных узроставых катэгорыях:

6 гадоў – 10 гадоў (уключна)

11 гадоў – 13 гадоў (уключна)

14 гадоў – 17 гадоў (уключна).

1.7. Для арганізацыі і правядзення конкурсу фарміруецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт).

Аргкамітэт:

арганізуе кансультацыі для зацікаўленых аб парадку ўдзелу ў конкурсе;

зацвярджае склад журы;

распаўсюджвае інфармацыю аб правядзенні конкурсу;

зацвярджае рэзультаты конкурсу;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсу.

## 2. Афармленне творчых работ

2.1. Патрабаванні да афармлення конкурсных работ ў намінацыі "Літаратурная творчасць":

тэкст павінен быць прадстаўлены на беларускай мове, афармлены на старонках у фармаце А4, у рэдактары WORD, шрыфт Times New Roman, кегль 14, інтэрвал адзінарны;

творчая работа павінна змяшчаць тытульны ліст з наступнай інфармацыяй: прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам); узрост; назва ўстановы адукацыі і клас (аб'яднанне па інтарэсах); прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (цалкам), назву твора і жанр.

Прымаюцца літаратурныя творы: вершы, апавяданні, эсэ (аб'ём – да 3 лістоў).

Дасылаючы на конкурс твор, удзельнік гарантуе, што з'яўляецца яго аўтарам і не парушае аўтарскіх правоў.

Аргкамітэт не разглядае творы, у якіх выкарыстоўваецца ненарматыўная лексіка, гучаць заклікі да насілля альбо міжнацыянальнай варожасці.

2.2. Патрабаванні да афармлення конкурсных работ ў намінацыі "Выяўленчае мастацтва":

выяўленчыя работы могуць быць прадстаўлены ў выглядзе ілюстрацый да твораў пісьменніка; малюнкаў, прысвечаных мясцінам, звязаным з жыццём і творчасцю Янкі Маўра;

выяўленчыя работы могуць быць выкананы ў розных відах (жывапіс, графіка, змешаная тэхніка, калаж) выяўленчага мастацтва, любымі матэрыяламі: гуаш, акварэль, алей, пастэль, крэйды, аловак і інш;

памер творчых работ не больш, чым 50x70 см (А2).

Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі работ з'яўляюцца: адпаведнасць тэме конкурса, мастацкі або тэхнічны ўзровень выканання творчай працы, арыгінальнасць, культура афармлення.

Да кожнай работы з адваротнага боку павінна быць прымацавана этыкетка памерам 5x10 см з наступнымі звесткамі:

прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам);

узрост;

назва работы;

прозвішча, імя і імя па бацьку педагога (цалкам);

назва ўстановы адукацыі і клас (аб'яднанне па інтарэсах).

2.3. Патрабаванні да афармлення конкурсных работ ў намінацыі "Мініяцюра (інсцэніроўка)":

на конкурс прадстаўляецца відэаролік (ў фарматах wmv, avi, DVD-Video) мініяцюры (інсцэніроўкі) па творах Янкі Маўра, запісаную на відэаносьбіт;

максімальная працягласць выканання адной конкурснай работы да 5 хвілін;

колькасць удзельнікаў творчай працы неабмежавана.

У роліку могуць выкарыстоўвацца фотаздымкі, але не набор фотаздымкаў, пакладзены на музыку (слайд-шоў), а "нарэзка" відэафрагментаў з агучваннем.

На конкурс не прымаюцца ролікі рэкламнага характару, якія абражаюць годнасць і пачуцці іншых людзей, якія не ўкладваюцца ў тэматыку конкурсу.

Крытэрыі ацэнкі творчых работ: артыстычнасць і арыгінальнасць выступу; мастацкае афармленне (рэквізіт); музычнае, гукавое суправаджэнне; сцэнічнасць (пластыка, касцюм, культура выканання); стыль, пісьменнасць.

## 3. Умовы правядзення конкурсу

3.1. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца прадстаўленыя ў тэрмін творчыя работы, змест якіх адпавядае зацверджаным намінацыям конкурсу, паводле сапраўднага палажэння.

3.2. Дзейнічае абмежаванне па колькасці работ, якія дасылаюцца на конкурс. Ад аднаго аўтара прымаецца не больш за 1 (адну) творчую заяўку ў кожнай намінацыі.

3.3. У конкурсе ўдзельнічаюць творчыя работы нідзе раней не надрукаваныя.

3.4. Удзельнікі конкурсу даюць сваю згоду на апрацоўку сваіх персанальных дадзеных: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост і іншых персанальных дадзеных.

3.5. Удзел у конкурсе азначае згоду аўтара (аўтараў) на размяшчэнне відэароліка на web-ресурсах арганізатараў конкурсу.

3.6. Конкурс праводзіцца ў тры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

I этап (адборачны) з 3 студзеня па 28 лютага 2023 года – ва ўстановах адукацыі;

II этап (адборачны) з 1 сакавіка па 31 сакавіка 2023 года – раённы (гарадскі);

III этап (заключны) з 3 красавіка па 17 красавіка 2023 года – абласны.

Падвядзенне вынікаў конкурсу да 26 красавіка 2023 года.

3.7. Пасля завяршэння раённага (гарадскога) этапу конкурсу ўпраўленнямі па адукацыі райвыканкамаў, упраўленнямі (аддзелам) па адукацыі, спорце і турызме райгарвыканкамаў прадстаўляюцца заяўкі на ўдзел (Дадатак) разам з творчымі работамі на электронны адрас: concurs-bellitmuseum@yandex.by (з паметкай “Янка Маўр: вандраванне па зорках”) і на адрас: установа “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”, 220029, г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 13. Тэлефон для даведак: +375 (17) 395-44-47.

## 4. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў

4.1. У кожнай намінацыі прызначаецца па 3 прызавых месцы (I, II і III месца) ў кожнай узроставай групе. Пераможцы атрымаюць дыпломы і памятныя падарункі:

у намінацыі “Літаратурная творчасць” ад Мінскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”;

у намінацыі “Выяўленчае мастацтва” ад галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага выканаўчага камітэта;

у намінацыі “Мініяцюра (інсцэніроўка)” ад установы “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”.

4.2. Фінал конкурсу адбудзецца 12 мая 2023 года ў дзяржаўнай установе адукацыі “Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі” па адрасе: г. Мінск, вул. П.Глебкі, 88 падчас правядзення святочнага мерапрыемства, прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Маўра.

4.3. Арганізацыйным камітэтам могуць быць прадугледжаны спецыяльныя прызы ў рамках асобных намінацый конкурсу:

за творчы падыход і арыгінальнасць задумкі;

за высокае выканальніцкае майстэрства;

за захаванне гістарычнай памяці і мастацкую выразнасць.

Дадатак

Заяўка
на ўдзел у творчым конкурсе **"Янка Маўр: вандраванне па зорках"**,
прысвечаным 140-годдзю з дня нараджэння
беларускага пісьменніка Янкі Маўра

Назва намінацыі: ___________________.

Назва творчай работы: ________________________.

1. Раён
2. Назва ўстановы адукацыі
3. Клас (аб'яднанне па інтарэсах).
4. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам).
5. Узрост
6. Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка (цалкам).
7. Кантактны тэлефон